АД “СНЕЖНЫХ ГРАМНІЦ” ДА “У ШУМЕ ЖЫТНЯГА СВЯТЛА”: СІМВАЛІЧНАСЦЬ НАЗВАЎ КНІГ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Г. М. МЯТЛІЦКАЯ[a]

[a]*Кафедра беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

У артыкуле разглядаецца лірыка Я. Янішчыц, у творчасці якой паэзія набыла больш высокі лірычны змест і разам з тым шырокую жыццёвую эпічнасць. Творчасць паэтэсы вызначаецца ўзмацненнем сувязі з жыццём, голас яе у большай ступені стаў голасам самога жыцця, што выявілася і ў сімвалічнасці назваў кніг Я. Янішчыц.

Ключавыя словы: лірыка, сімволіка назваў, светаадчуванне лірычнай гераіні, семантыка, амбівалентнасць мыслення.

FROM “SNOW CANDLEMAS” TO “IN THE NOISE OF RYE LIGHT”: SYMBOLIC NAMES OF EUGENIA YANISHCHITS’S BOOKS

A. METLITSKAYA[a]

[a]*Department of the Belarusian literature and culture of the Philological Faculty of Belarusian State University*

The article deals with the lyrics of E. Yanishchits, in her works poetry has acquired a higher lyrical content and at the same time a broad epic life. Her works are determined by the gain connection with life, her voice to a greater extent has become the voice of life itself, which was manifested in the symbolism of the names of poet collection.

Key word: lyrics, symbolism of names, attitude of lyrical heroine, semantics, thinking ambivalence

Узор цытавання: Мятліцкая Г.М. Ад “Снежных грамніц” да “У шуме жытняга святла”: сімвалічнасць назваў кніг Яўгеніі Янішчыц // Сафія. 2016. № 1. С. 17–24.

For citation: Metlitskaya A. From “Snow candlemas” to “In the noise of rye light”: symbolic names of Eugenia Yanishchits’s books // Sofia. 2016. № 1. P. 17–24 (in Belar.).

Аўтар:
Мятліцкая Ганна Мікалаеўна — кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры і культуры філалагічнага факультэта БДУ

Author:
Metlitskaya Anna — PhD of Philology, Senior lecturer of the Belarusian literature and culture Department of the Philological Faculty of BSU
phyl@bsu.by

Мятліцкая Г.М.
(Мінск, БДУ)

АД “СНЕЖНЫХ ГРАМНІЦ” ДА “У ШУМЕ ЖЫТНЯГА СВЯТЛА”: СІМВАЛІЧНАСЦЬ НАЗВАЎ КНІГ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Лірыка — своеасаблівае паэтычнае пазнанне, у аснове якога ляжыць падпарадкаванне пачуцця думцы, што дае магчымасць узвысіцца над ім. З гэтага вынікаюць якасці лірычнага адлюстравання: сціслaсць, недагаворанасць, гэтак званы лірычны беспарадак [1, с. 448–449]. “Лірыка ў асноўным так і будуецца — на кантрастах, антытэзах, супрацьпастаўленнях і сутыкненнях пачуццяў і розных тэндэнцый. Выказаны з дапамогай абстракцый, пазбаўлены канкрэтна-пачуццёвага элемента, паэтычны вобраз можа здавацца непаразуменнем, алагізмам. У паэзіі свая логіка. Вывад у ёй часта ідзе не ад думкі, а ад пачуцця, і апошнім ён звычайна абгрунтаваны і апраўданы” [2, с. 33]. Прыведзеныя меркаванні даследчыкаў аб’ядноўваюцца галоўным: у аснове лірычнага твора заўсёды ляжаць пачуцці, перажыванні аўтара, якія ствараюць “малюнак” твора — настрой і вобразы, у цэлым — гэта непадпарадкаванае фармальна выяўленне духоўнага свету. А ўсё разам дае адметнасць, адрозненне ад іншых.

“Мне здаецца, лірыка, як крыніца з зямлі, заўсёды бярэ свой пачатак з біяграфіі паэта”, — запісаў у дзённіку ў 1935 годзе Максім Танк [3, с. 20]. Ды і сама Яўгенія Янішчыц разумела і адзначала гэта: “Пісьменнік пачынаецца яшчэ ў маленстве. І гэта апраўдана, бо запамінальнасць, уражлівасць, атрыманыя яшчэ ў маленстве, прадаўжаюць будзіць творцу на працягу ўсяго яго творчага жыцця” [4, с. 70]. Якім было маленства будучай паэтэсы? З аднаго боку, прыгажосць і таямнічасць прыроды Палесся, светапогляд палешукоў (дарэчы,

цалкам міфалагічны), з другога — сама атмасфера нялёгкага пасляваеннага часу, калі “душа не магла не адчуць, не запомніць аб’ядноўваючай усіх шчырых людзей — дабраты і спагады” [4, с. 69]. Пазней, калі Яўгенія пачынае пісаць вершы, землякі, “гэтыя самыя розныя і непадобныя людзі і перад вачамі і мысленна стаялі перада мной. І кожны не толькі сваёй постаццю, сваім абліччам, але перш за ўсё сваім голасам, інтанацыяй, песняй падказваў словы, думкі, пачуцці”, — прызнаецца ў інтэрв’ю Яўгенія Янішчыц. Прыязна згадвае паэтэса і свайго любімага настаўніка Фёдара Фёдаравіча Цудзілу, які “шмат каго з выпускнікоў Парэцкай сярэдняй школы Пінскага раёна натхніў і благаславіў у філалогію” [4, с. 70].

Падчас вучобы ў школе з’явілася першая публікацыя вершаў Яўгеніі Янішчыц у пінскай раённай газеце. Прага творчасці прыводзіць дзяўчыну на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, дзе ў літаратурным асяродку набірае моцы яе самабытны талент. Вершы пачынаючай паэтэсы адразу былі заўважаны. Іх ахвотна друкуюць газеты і часопісы, пра іх гавораць студэнты і пісьменнікі. Яны ўсё больш і больш здабываюць грамадскую прыхільнасць. Калі Я. Янішчыц была студэнткай пятага курса, убачыў свет яе першы зборнік паэзіі “Снежныя грамніцы”. Варта адзначыць, што тэмай дыпломнай работы студэнткі-паэтэсы была інтымная лірыка, цытаваліся словы Аляксандра Блока: “Толькі закаханы мае права называцца Чалавекам” і “Драматызм свайго існавання я бачу ў тым, што я лірык” [5, с. 217]. А гэта цалкам адпавядае духоўным пошукам лірычнай гераіні, яе імкненню да светлага сапраўднага кахання, а таксама адчуванню любові да радзімы і сувязі з беларускай гісторыяй. Маладое захапленне жыццём, любоў да ўсяго роднага і дарагога: палескай прыроды, блізкіх сэрцу паэтэсы людзей, іх “жывой і непаўторнай” мовы — напаўняюць раннія творы.

Кніга была прыхільна сустрэта. Таму што, як піша Д. Бугаёў, “Янішчыц пачала з сапраўднай паэзіі, пазбаўленай усякай падробкі і вымучанасці, няшчырасці і паўпраўды, з паэзіі, напоўненай значнымі і арыгінальнымі думкамі, сагрэтай глыбокім і ўсхваляваным пачуццём” [6, с. 336]. Сама ж Я. Янішчыц напіша ў эсэ-ўспаміне пра І. Мележа, што пісьменнік сказаў пра кніжку: “Харошая, светлая, але суму штось мнагавата для Вашага ўзросту” [7, с. 274]. Уважліва чытаў Іван Паўлавіч, за ружовым юным бачаннем свету ўлавіў і

першы ціхі смутак. Усе далейшыя зборнікі паэтэсы працягваюць і пашыраюць тэмы ранніх вершаў, паглыбляюць іх матывы. Паступова нарастае ўсё больш драматызм адчування жыцця, з'яўляюцца матывы адзіноты, расстання з каханым, боль безадказнага кахання. Паэтэса адна гадуе сына, бацька якога пайшоў да другой. Ды і шмат іншых выпрабаванняў цярпліва і мужна пераадольвае жанчына. Асабісты боль яна ўспрымае як загартаванне для сапраўднай паэзіі*, і паступова ў кожным новым зборніку яе паэзія набірае ўсё большую сілу і вышыню.

Назвы для зборнікаў Яўгенія Янішчыц, як правіла, бярэ са сваіх твораў. Звернем увагу на змяненне светаадчування лірычнай гераіні шляхам раскрыцця сімволікі назваў паэтычных зборнікаў.

"Снежныя грамніцы" (1970) — у зборніку ёсць верш "Рана ўсталі маладзіцы", у якім згадваюцца "праславянскія грамніцы". Народнае свята адзначалася 2 лютага па старым стылі, у наш час гэта 15 лютага. Вучонымі вылучаюцца тры асноўныя меркаванні аб паходжанні назвы свята: 1) ад імя язычніцкага бога Грамаўніка (Перуна) — бога веснавых навальніц; 2) паводле ўяўленняў нашых продкаў, пачынаючы з гэтага дня Юрай выпрабоўвае на нячыстай сіле свае стрэлы, і на Грамніцы можна пачуць першыя грымоты; 3) Стрэчанне, другая назва Грамніцаў, абазначае дзень, у які адбываецца сустрэча зімы з вясною. З Грамніцамі звязаны народныя прыкметы вызначэння надвор'я, а таксама рытуал асвячэння ў царкве свечак [9, с. 158]. У. Гніламёдаў тлумачыць назву "Снежныя грамніцы" як нечаканасць прыходу ў літаратуру юнай паэтэсы (як "гром — зімой!") [10, с. 175]. Пра яе можна таксама сказаць, што гэта сімвалічны вобраз юнацтва, пачатку новага ў жыцці, калі думалася светла і ясна, а сэрца было адкрыта веры, дабру.

Пачатковая назва, якую збіралася даць Яўгенія Янішчыц гэтай кніжцы, — "Непрыручаная птушка". Верш пра непрыручаную птушку выяўляе духоўны свет лірычнай гераіні, яе нескаронасць і свабоду, а таксама напоўненасць і непаўторнасць кожнага дня ў яе жыцці, але, магчыма, Янішчыц "адмовілася

* Такую выснову можна зрабіць паводле некаторых вершаў (напрыклад, "За высокай кручаюгарою..." [8, с. 169], "Не трэба мне ўсмешкі маёвай..." [8, с. 197]), а таксама радкоў з ліста Яўгеніі Янішчыц да Галіны Каржанеўскай [гл. 7, с. 273].

ад гэтага намеру, бо Г. Юрчанка, заўважыўшы той верш у перыёдыцы, напісаў на яго даволі з'едлівую пародыю" [7, с. 278].

Наступны паэтычны зборнік "Дзень вечаровы" (1974) быў адзначаны прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі. Галоўны матыў, якім прасякнуты многія яго творы, — расчараванне ў каханні. Аднак смутак, туга, страчанасць кахання напоўнены надзеяй, верай, што ўсё яшчэ можна вярнуць. У цэлым гэта больш сур'ёзны, сталы позірк на жыццё. Дзень вечаровы — дзень без сонца, без кахання.

Зборнік лірыкі "Ясельда" (1978) — у асноўным гэта філасофскае асэнсаванне жыцця. Многім вершам уласцівы недагаворанасць і таямнічасць (дарэчы, любімы мастацкі прыём у творчасці Я. Янішчыц — спалучэнне канкрэтнага і асацыятыўнага). Назва зборніка — па аднайменнай паэме "Ясельда", прысвечанай светлай памяці бацькі. Ясельда — рака роднага Палесся, якая духоўна падтрымлівае і дае сілы.

Назва зборніка "На беразе пляча" (1980) адлюстроўвае паступовае змяненне ў разуменні жыцця лірычнай гераіняй: прыходзяць стрыманасць і знешні спакой ("На беразе пляча / Спакойны наступ лета" [11, с. 90]).

Запас паперы адкладу на час,
Сустрэну дзень у грамадзе кіпучай.
Адчую побач шырыню пляча
І шырыню радзімы неўміручай [11, с. 12].

За кнігу лірыкі "Пара любові і жалю" (1983) прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Янкі Купалы ў 1986 годзе. Назва "Пара любові і жалю" — алегорыя новага душэўнага стану (гэты радок абыграны ў вершы "Бярэш мяне, палоніш зноў" [12, с. 63]). Прыход вясны — "пара любові й згоды" ў прыродзе. Росквіт. Але не зажыла яшчэ "рана нажавая" і болем напоўнена сэрца — "пара любові й жалю" ў жыцці паэтэсы. "Пара любові і жалю. Не выпадковае спалучэнне, — піша А. Сямёнава, — паэтэса ўвесь час трымае ў памяці, што свет эмпірычнай рэчаіснасці ў святочнасці і светлаце сваёй мае і трагічную антытэзу... Паўната жыцця заўсёды нясе ў сабе шчасце і смутак, свята і клопаты, радаснае і трагічнае... Радкі стрымана і цнатліва гавораць пра драму лірычнай гераіні" [13, с. 161–162].

Духоўным запаветам Я. Янішчыц можна лічыць кнігу “Каліна зімы” (1987). Тут найбольш складана вызначыць сімвалічнае значэнне назвы. У вершы “Каліна зімы” [8, с. 90] паўстае вобраз “каліны-сяброўкі” (у фальклоры каліна сімвалізуе дзяўчыну) і гаворыцца, што доля самой паэтэсы “нібы гронка любові // Б’ецца над сцішанай голькай жыцця”. Тут псіхалагічны паралелізм: гронка чырвоных ягад каліны — “надзея жыцця”. Такое ж пачуццё, спадзяванне на вяртанне кахання, жыве ў душы лірычнай гераіні. У кантэксце твора становіцца зразумелым значэнне спалучэння слоў “каліна зімы” — “зімой закіпае каліна”, гэта значыць яе ягады “свецяцца ціха-шчасліва праз снег”. І ў той жа час спалучэнне колераў чырвонага (каліны) і белага (зімы) у назве зборніка не адназначнае і не такое простае. Чырвоны колер — колер крыві і жыцця — таксама сімвал кахання ў фальклоры. Гэты колер мае ўстойлівую станоўчую семантыку. Белы — амбівалентны колер. Ён можа супастаўляцца (як станоўчы) з чорным колерам (як адмоўным).

Як адзначае Я. Крук, белы колер у народнай культуры беларусаў — “сімвал смутку, жалобы, гора, смерці, трансфармацыі, пераходу ў іншы стан, сімвал дарогі з аднаго свету ў іншы. У міфалагічным сэнсе слова — гэта сімвал бязмежнасці, вечнасці, Сусвету” [14, с. 69]. Даследчык дае цікавае тлумачэнне кампазіцыі колераў беларускага ручніка (жыццё → смерць → жыццё), таму што ручнік адлюстроўвае ўяўленне нашых продкаў пра жыццёвы шлях: жыццё на гэтым свеце (якое сімвалізуе чырвоны колер на адным з канцоў ручніка), смерць або пераход у іншы свет (белая сярэдзіна), жыццё пасля смерці (чырвоны колер другога канца ручніка).

Паводле меркавання Д. Бугаёва, “назва кнігі мае знак... супярэчлівасці [жыцця], бо вобраз, вынесены ў загаловак (“каліна зімы”), асэнсоўваецца... удваістым плане як “надзея жыцця” і разам з тым як увасабленне яго нялёгкасці, гаркоты, суму, няхай сабе і светлага” [15, с. 273]. Улічваючы думку Я. Крука пра семантыку белага колеру, вобраз “каліны зімы” можа адлюстроўваць сувязь жыцця і смерці, жыцця і вечнасці.

Зборнік выбраных твораў “У шуме жытняга святла” (1988) складзены рукой паэтэсы. У яго ўвайшлі лепшыя вершы і паэмы, напісаныя Яўгеніяй Янішчыц за 1970–1987 гады. Гэта апошняе прыжыццёвае выданне твораў Я. Янішчыц. Так распарадзіўся лёс. Назва “У шуме жытняга святла” ўзята

са зборніка “Пара любові і жалю”, у якім змешчаны аднайменны верш, галоўная думка якога:

І покуль дыхае планета,
Не вынішчаецца датла
Душа народа і паэта
У шуме жытняга святла [12, с. 62].

Жыта — жыццё і святло. Жыццё — жыта і святло. Жыццялюбства — галоўная ідэя творчасці Я. Янішчыц. Адчуванне гармоніі, еднасці з Сусветам, захапленне яго прыгажосцю, любоў да ўсяго жывога. І ў той жа час — адчуванне горычы, драматызму жыцця (“Аптымістычна-горкая, лясная, // Як і сама паэзія мая” [8, с. 113]).

“Тайна” паэзіі Янішчыц “у своеасаблівым лірызме паэтэсы — празрыстым, ціхім, песенна-плаўным... У яе радку вабіць магія тону, гуку, музыкі, якія прыцягваюць да сябе, нібыта закалыхваюць, зачароўваюць...” [16, с. 235]. Знешне простая, але ўнутрана глыбокая, самабытная творчасць Яўгеніі Янішчыц выяўляе маральна-этычныя каштоўнасці беларусаў, працягвае лепшыя традыцыі фальклору і беларускай паэтычнай класікі (Я. Купалы, М. Багдановіча...). Талент і сур’ёзнае стаўленне да творчай працы робяць лірыку Яўгеніі Янішчыц яркай і адметнай з’явай беларускай літаратуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Потебня А.А. Эстетика и поэтика. М., 1972.
2. Шпакоўскі І.С. Структура вершаванага вобраза. Умоўная асацыятыўнасць у сучаснай савецкай паэзіі. Мн., 1972.
3. Танк М. Лісткі календара // Танк М. Збор твораў: у 6 т. — Т. 6: Дзённікі; літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1981. С. 5–352.
4. Янішчыц Я. “...Мой лёс, мой боль — мая паэзія” // Беларуская мова і літаратура ў школе. 1988, № 3. С. 69–73.
5. Лойка А. Кладачка тоненька // Маладосць. 1995, № 4. С. 212–232.
6. Бугаёў Д. Усхваляванае слова паэтэсы // Бугаёў Д. Талент і праца: літ. крытыка. Мн., 1979. С. 320–350.
7. Бугаёў Д. Летуценніца на скразняках эпохі // Полымя. 1998, № 11. С. 271–285.
8. Янішчыц Я. Каліна зімы. Мн., 1987.
9. Васілевіч У.А. Грамніцы // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 158.
10. Гніламёдаў У. Разгадваючы тайны быцця (Яўгенія Янішчыц) // Гніламёдаў У. Ля аднаго вогнішча: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1984. С. 170–184.

11. Янішчыц Я. На беразе пляча. Мн., 1980.

12. Янішчыц Я. Пара любові і жалю. Мн., 1983.

13. Сямёнава А. “І лёгка я з зямлёю гавару...” // Сямёнава А. Слова сапраўднага лад. Літаратурныя эцюды. Мн., 1986. С. 157–164.

14. Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2000.

15. Бугаёў Д. Арганічнасць таленту (Пра дзве кніжкі паэтэсы) // Бугаёў Д. Арганічнасць таленту: літаратурна-крытычныя артыкулы. Мн., 1989. С. 256–288.

16. Гніламёдаў У. Сучасная беларуская паэзія. Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс. Мн., 1983.